УДК 631.53.048:631.84

У. С. ГОНТАРАЎ, А. В. СЯРГЕЕВА, Г. З. ПАРХАМОВІЧ

УПЛЫЎ НОРМ ВЫСЯВАННЯ І ДОЗ УНЯСЕННЯ АЗОТНЫХ УГНАЕННЯЎ НА ЎРАДЖАЙ І ЯКАСЦЬ ЗБОЖЖА АЗІМАГА ЖЫТА ПУХАЎЧАНКА

Азімае жыта ва ўмовах Беларусі з'яўляецца адной з вядучых збожжавых культур. У Гомельскай вобласці на долю азімага жыта прыпадае больш за 46% валавых збораў збожжа.

Развіццё аптымальнай фотасінтэзуючай паверхні ў пасеве дасягаецца ўстанаўленнем норм высявання і наступным кіраваннем працэсам кушчэння, што ў асноўным ажыццяўляецца драбленнем агульнай нормы азотнага ўгнаення.

Доследы па выяўленні аптымальных норм высявання і доз унясення азотных угнаенняў на ўраджай і якасць збожжа азімага жыта право-

дзіліся ў 1987—1989 гг. на абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі. Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая супескавая, развіваецца на рыхлым супеску, які падсцілаецца з глыбіні 80—90 см марэнным суглінкам. Ворны гарызонт глебы характарызуецца наступнымі аграхімічнымі паказчыкамі: колькасць гумусу (паводле Цюрына) — 2,0%, pH_{KCl} 5,9—6,1, гідралітычная кіслотнасць — 1,3—1,8 мэкв/100 г глебы. Колькасць P_2O_5 (паводле Кірсанава) — 26,1—29,8 і K_2O (паводле Маславай) — 15,4—19,5 мг/100 г глебы.

Папярэднік азімага жыта — ячмень. На фоне арганічных (25 т/га) і фосфарна-калійных ($P_{70}K_{110}$) угнаенняў вывучаліся наступныя варыянты азотнага жыўлення: N_{60} і N_{90} увесну пры аднаўленні вегетацыі, N_{120} (90 кг/га ўвесну, 30 кг/га ў фазу выхаду ў трубку), N_{150} (90 кг/га ўвесну, 30 кг/га ў фазу выхаду ў трубку і 30 кг/га ў фазу каласавання). Пры сяўбе выкарыстоўвалі чатыры нормы высявання: 3,0, 4,0, 5,0 і 6,0 млн шт/га ўсходжых зярнят. Памер уліковай плошчы дзялянкі 50 м², паўтаральнасць чатырохразовая.

Даследаванні праводзілі па доследах 2 і 3 па аналагічнай схеме з ужываннем хімічных сродкаў аховы раслін, прадугледжаных інтэграванай сістэмай без выкарыстання сродкаў аховы раслін.

Вынікі даследаванняў, пададзеныя ў табл. 1, паказваюць, што больш высокі ўраджай збожжа (56,6 ц/га) атрыманы ў доследзе з ужываннем хімічных сродкаў аховы раслін пры сяўбе нормай высявання 5,0 млн шт. усходжых зярнят на 1 га і ўнясенні N_{120} у два прыёмы (90 кг увесну, 30 кг у фазу выхаду ў трубку). Прыбаўленне ўраджаю ў параўнанні з кантролем склала 16,0 ц/га.

Трэба адзначыць, што ва ўсіх варыянтах гэтага доследу ўраджай збожжа на 4,9—17,0 ц/га вышэйшы ў параўнанні з доследам, дзе не ўжываліся хімічныя сродкі аховы раслін. Атрыманню высокага ўраджаю ў значнай ступені садзейнічала зніжэнне засмечанасці пасеваў у час вегетацыі.

Зялёная маса пустазелля ў доследзе з ужываннем сродкаў аховы

Табліца 1. **Уплыў норм высявання і ўзроўню мінеральнага жыўлення на ўраджай збожжа азімага жыта, ц/га**

Норма высявання, млн зярнят/га	Угнаенні, кг/га д. р.	Дослед 2			Дослед 3		
		1988 г.	1989 г.	сярэдняе	1988 г.	1989 г.	сярэдняе
3,0	$P_{70}K_{110}$ — фон	27,11	29,1	28,1	30,6	35,4	33,0
	Фон + N_{60}	32,6	34,8	33,7	43,0	53,4	48,2
	Фон + N_{90}	35,8	37,1	36,4	46,9	55,9	51,4
	Фон + N_{120}	36,4	39,2	37,8	48,7	60,8	54,8
	Фон + N_{150}	35,6	42,4	39,0	47,7	58,8	53,2
4,0	$P_{70}K_{110}$ — фон	29,0	31,9	30,8	32,9	37,2	35,1
	Фон + N_{60}	33,3	36,1	34,7	44,0	54,8	49,4
	Фон + N_{90}	35,7	37,7	36,7	45,1	57,8	51,4
	Фон + N_{120}	40,2	39,3	39,8	49,1	60,1	54,6
	Фон + N_{150}	35,8	40,1	37,9	47,4	60,4	53,9
5,0	$P_{70}K_{110}$ — фон	30,9	34,8	32,8	40,0	41,1	40,6
	Фон + N_{60}	34,2	36,7	35,4	45,8	57,3	51,6
	Фон + N_{90}	40,1	42,5	41,3	48,3	59,6	53,9
	Фон + N_{120}	39,4	41,8	40,6	51,4	61,8	56,6
	Фон + N_{150}	39,0	40,6	39,8	49,3	55,9	52,6
6,0	$P_{70}K_{110}$ — фон	30,5	33,7	32,1	38,0	40,5	39,3
	Фон + N_{60}	34,1	36,9	35,5	44,0	58,2	51,1
	Фон + N_{90}	37,2	42,6	39,9	45,8	57,7	51,8
	Фон + N_{120}	33,6	41,2	37,4	47,4	57,4	52,4
	Фон + N_{150}	33,1	40,8	36,9	42,3	56,0	49,2
$НІР_{095}$, ц/га для норм азотных угнаенняў		1,16 1,28	0,88 0,92		1,32 1,48	1,05 0,57	

Заўвага. Дослед 2 — без хімічнай аховы, 3 — з хімічнай аховай раслін. Тое ж у табл. 2 і 3.